Прафесар М.В.ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ

# *Асновы Дзяржаўнасьці Беларусі*

Мінск
1994

Прафесар М.В.ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ

# АСНОВЫ ДЗЯРЖАЎНАСЬЦІ БЕЛАРУСІ

Мінск
1994

ББК 67.3 (2Б)
Д71
УДК 342.000.93 (476)

Тэкст друкуецца па выданні: Доўнар-Запольскі М.В. Асновы Дзяржаўнасьці Беларусі. - Городно: Міністэрства Беларускіх спраў, 1919.

Выданне выходзіць па ініцыятыве Агенцтва "Геронт-А" Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны.

Доўнар-Запольскі М.В.

Д71 Асновы Дзяржаўнасьці Беларусі. - Мн.: ВПП Дзяржэканомплана Рэспублікі Беларусь, 1994. - 23 с.

У брашуры раскрываюцца вытокі беларускай дзяржаўнасці, абгрунтоўваецца права беларускага народа на незалежнасць і суверэнітэт.

Выданне арыентавана на шырокае кола чытачоў.

Д 3420000093

ББК 67.3 (2Б)

© Слова аб аўтары. Ганущ А.Г., 1994.

# Слова аб аўтары

*Няпростым быў лёс выдатнага беларускага гісторыка, прафесара Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага. Усё сваё жыццё аддаў ён справе беларускага адраджэння, але аказаўся выкрэсленым з памяці некалькіх пакаленняў беларусаў, а яго навуковыя працы на доўгія гады трапілі ў спецхраны.*

*Нарадзіўся М.Доўнар-Запольскі 2 чэрвеня 1867 года ў г.Рэчыца Мінскай губерніі. Скончыў Кіеўскі ўніверсітэт св. Уладзіміра. У 1905 годзе абараніў доктарскую дысертацыю, выкладаў у Кіеве, Маскве, Баку, Харкаве, Мінску. Сярод яго вучняў - такія выдатныя гісторыкі, як А.М.Гневушаў, Б.Г.Курц, У.І.Пічэта, П.П.Смірноў.*

*М.Доўнар-Запольскі пакінуў багатую навуковую спадчыну - больш за 200 прац па этнаграфіі, сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы. Ён быў адным з першых, хто вызначыў Беларусь у якасці асобага аб'екта гістарычнага даследвання, заклаўшы тым самым падмурак беларускай нацыянальнай гістарыяграфічнай канцэпцыі.*

*М.Доўнар-Запольскі з'явіўся аўтарам першых спецыяльных прац, прысвечаных гісторыі беларускай дзяржаўнасці, у якіх даказываў, што Беларусь мае права на незалежнасць і самавызначэнне. Сярод гэтых прац - брашура "Асновы дзяржаўнасьці Беларусі". Напісаная ў 1918 годзе і перакладзеная на розныя мовы, яна была разаслана ўрадам БНР па еўрапейскіх краінах з тым, каб яны падтрымалі Беларускую Народную Рэспубліку. Такім чынам, брашура "Асновы дзяржаўнасьці Беларусі" стала ідэйным абгрунтаваннем беларускага суверэнітэту.*

*Скептыкі зазначаць: М.Доўнар-Запольскі даказваў права на незалежнасць "бумажнай" рэспублікі, якая не здолела пайсці далей свайго абвяшчэння і ўвогуле аказалася нежыццяздольнай. Але, думаецца, справа не ў тым, якая з абвешчаных рэспублік - БНР ці БССР - мела гістарычныя перспектывы, або да якой з іх лепш ставіўся вучоны. Для Доўнар-Заполь-*

*скага галоўным быў сам факт існавання беларускай дзяржаўнасці як рэалізацыя заканамернасцяў нацыянальнага развіцця, як перадумова руху ў будучыню. І тое, у якой форме гэтая дзяржаўнасць вызначыцца - гэта ўжо пытанне другога парадку. Дарэчы, Доўнар-Запольскі плённа працаваў і ў Савецкай Беларусі. У 1925-1926 гг. ён з'яўляўся прафесарам Белдзяржуніверсітэта, займаў пасаду старшыні гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта. Аднак у хуткім часе ён быў вымушаны пакінуць Мінск і пераехаць у Маскву. Кляймо "нацдэма" назаўсёды перакрыла шлях на Радзіму . . .*

*Магутная рэпрэсіўна-ідэалагічная машына паволі набірала хуткасць, падміная пад сябе любыя праяўленні навуковай творчасці, якія не ўкладваліся ў рамкі стандартных падыходаў і канцэпцый. Але вучоны не змог, не пажадаў прыстасоўваць свае погляды да змяняючыхся ўмоў. Бо закладзены гэтыя погляды былі з юнацтва і аказаліся надзвычай устойлівымі. Яшчэ ў 1888 годзе ў артыкуле "Беларускае мінулае" Доўнар-Запольскі адзначаў, што беларускі народ мае ўласную гісторыю і высокую культуру, а значыць, заслугоўвае таго, каб быць раўнапраўным членам сям'і славянскіх народаў. Праз трыццаць год ён паўторыць тыя ж словы ў брашуры "Асновы дзяржаўнасьці Беларусі". Толькі зараз гісторык зробіць гэта на больш сталым узроўні, і тыя палажэнні, якія некалі выказваліся ў артыкуле "Беларускае мінулае", увасобяцца ў стройнай навукова абгрунтаванай мадэлі, набываючы характар канцэпцыі палітычнай гісторыі.*

*Безумоўна, не ўсе тэзісы, сфармуляваныя ў "Асновах дзяржаўнасьці Беларусі", з'яўляюцца бясспрэчнымі. Аднак трэба памятаць, што брашура выйшла ў свет у пераломны гістарычны перыяд, калі вырашалася пытанне аб самім існаванні беларускай дзяржавы. Таму ў некаторых момантах Доўнар-Запольскі мог дапусціць залішнюю эмацыянальнасць - ведзь ён ускладаў на гэту работу і станоўчыя агітацыйныя задачы.*

*Сучасная ўчора, брашура "Асновы дзяржаўнасьці Беларусі" актуальна і сёння. Хіба толькі некаторыя выказванні патрабуюць агаворак з пункту гледжання нашых дзён. Так, калі Доўнар-Запольскі называе літоўскі народ у XIV стагоддзі малакультурным, то ён мае на ўвазе адносна невысокі ўзровень цывілізаванасці старажытных літоўцаў - непісьменнасць, політэістычныя вераванні і г.д. Нельга разумець літаральна і тое, што да Беларусі гісторык адносіць Смаленскую губернію, а таксама часткі Чарнігаўскай, Пскоўскай, Цвярской, Калужскай і Арлоўскай губерній. Вучоны тут гаворыць аб прынятых этнаграфічных межах беларускай нацыі і тых землях, насельніцтва якіх яшчэ ў пачатку XX стагоддзя значна адрозніваласа ад рускага спецыфічнымі этнічнымі асаблівасцямі - мовай, традыцыямі, бытам.*

*Увогуле, М Доўнар-Запольскі ніколі не імкнуўся супрацьпаставіць беларускі народ якому-небудзь іншаму. І гэта невыпадкова. Ён быў чалавекам сапраўдных дэмакратычных поглядаў, інтэлігентам, для якога зняважыць чые-небудзь нацыянальныя пачуцці - гэта значыць зняважыць сябе. Вучоны марыў аб тым часе, калі яго народ рэалізуе свае права на самавызначэнне і будзе жыць вольна сярод добрых суседзяў. Гэтай справе аддаў ён усё сваё жыццё.*

*У 1994 г. спаўняецца 60 год са дня смерці М.В Доўнар-Запольскага. Ушануем жа яго памяць перавыданнем адной з найбольш яркіх яго работ.*

*А. Ганущ*

# *Асновы Дзяржаунасьці Беларусі*

## І.

Беларусь - гэта абшырная старонка, якая складаецца з губерній: Менскай, Магілеўскай і Смаленскай (цэлком), блізка усяе Вітэбскай губ. (апрача Рэжыцкага і Люцынскага паветау), блізка усяе Віленскай (апрыч часьцей Троцкага, Віленскага і Сьвенцянскага пав.), Гродзенскай губерні, трох пауночных паветау Чарнігаускай губ., ды з сумежных валасьцей губэрній: на заходзе - Сувалскай, на усходзе - Пскоускай, Тверскай, Калужскай і Арлоускай. Усяго абшару Беларусь мае каля 258.000 квадр. кіломэтрау,на якім жыве 12 мільенау беларусау і больш за 3 мільены іншых нацыянальнасцей - вялікарусау, жыдоу, палякау, татарау. Беларускі народ занімае гэны абшар, сядзючы на ім густой грамадой, у якую умешаны другія нацы, каторыя прыйшлі сюды з чужых краеу і пераважна гуртуюцца па гарадох і мястэчках.

Часамі даводзіцца чуць як быццам вагаючыяся і сумлеваючыяся галасы: ці можа Беларускі народ стварыць сваю асобную і ні ад каго незалежную дзяржаву, або прынамсі увайсьці у саюз дзяржау, як фэдэрацыйная частка? Гэткія ваганьні і сумлеваньні вынікаюць з незнаемства людзей з роднай мінуушчынай і з не даволі поунай ацэнкі культурнай стойкасьці беларускага народу.

Часамі также іншыя наіуна сумлеваюцца: дый ціж была калі наша Беларуская дзяржава? Прауда, пад гэткім назовам яна не існавала, як не існавалі у цяперашняй форме дзяржавы Італьянская, Бэльгійская, Украінская і інш. Але беларусы станавілі крэпка збудаваную дзяржаву, зложаную з беларускіх плямен так-званай Літоускай Русі, значыць, злучаных з Літоускім князьствам. І Беларусь, як зараз убачым, толькі зусім нядауна утраціла сьляды сваей колішняй крэпкай і стойкай дзяржаунасьці, меушай такія праявы разьвіцьця, якімі мы можам толькі пахваляцца з гордасьцю і павінны дабівацца аднауленьня іх.



Асновы беларускай дзяржаунай незалежнасьці глыбока заложаны у самым Беларускім народзе і апіраюцца на моцных фундамэнтах - гістарычных, этнаграфічных, лінгвістычных і эканамічных. Яны выяуляюцца ва усей мінуушчыне Беларусі, яны есьць у беларусау і цяпер, захаваныя глыбока у народных массах, - і затым-то наша дзяржаунасьць павінна апірацца на дэмакратычных элемэнтах краю.

Беларусы - гэта бадай ядыны народ (мо толькі апрача палякоу), які з прадвечных часоу жыве у свае старонцы, ніскуль сюды ня прыходзіу, дык і не набрауся чужацкіх элемэнтау. З гэтай прычыны паводлуг сваіх гістарычных і этнаграфічных асобнасьцей беларусы становяць найбольш чыстае славянскае племя, захавaушае і зверхны выгляд славяніна, і шмат адзнак яго псыхікі і быту.

Жаданьне збудаваць сваю дзяржауную незалежнасьць, уменьне бараніць яе, жаданьне дайсьці вольнага дэмакратычнага ладу - вось аснауныя рысы гістарычнай мінуушчыны Беларускага народу. І мы ня ведаем другога славянскага плямі, у якога гэта рыса выяулялася-бы ярчэй, чымся у нашых прашчурау.

## II.

Першае, аб чым нам апавядае наша найстарэйшая летапісь, гэта тое, што на абшары цяперашняй Беларусі жылі тры родныя сабе плямены: Крывічы, Дрыгвічы і Радзімічы. Першыя жылі уздоуж верхняе Дзьвіны і верхняга Дняпра, другія занімалі ваколіцы уздоуж Прыпяці, трэйція - землі, праз якія цячэ Сож. Навукай этнаграфіі, філологіі і гісторыі цяперака ужо цьверда даведзена, што гэныя тры плямены ужо у тыя часы ня рожніліся між сабой ані мовай, ані правам сваім, ані рэлігійнымі абрадамі, ды усімі гэтымі супольнымі адзнакамі вельмі рожніліся ад плямен, якія становяць пачатак Вялікарускага і Украінскага народау. Першыя запісаныя асобеннасьці беларускае мовы сягаюць VII сталецьця. Частка плямі Дрыгвічоу у часах перасяленьня народау пакінула свой край, прабілася на Балканскій палуостраў і пасялілася навакол

Салонік. Грэкі называлі іх Другувітамі. Мовы Другувітау навучыліся сьв. Кірыла і Мефодзій.

Сперша кожнае з беларускіх плямен жыло сваім асобным жыцьцем. Калі у другой палавіне IX сталецьця у Кіеві тварылася дзяржава "Русь", дык беларусы папалі у яе пазьней, чым усе другія. Споміж беларусау першая увайшла у склад Русі Смаленская часьць Крывічоу. У Дрыгвічоу быу свой князь, у Полацкіх Крывічоу - так сама асобны князь, Рагвалод. Толькі сьв. Валадзімір у другой палове X сталецьця зваявау Полацак, забіу Рагвалода і узяу сабе за жонку дачку яго, Рагнеду. Але нават і гэты князь ня здолеу удзяржаць Палачан у пакорнасьці Кіеву і дау ім за князя свайго сына, унука Рагвалодава. Цікауна, што пад той час, як усе "рускія" землі прызнавалі княжны род Рурыковічау, Полацкае княства мела сваіх асобных князеу з роду Рагвалода. Гэта дзівіла і старабытнага летапісца. Дый другія часьці на доуга асталіся пад Кіевам: кіеускія князі ужо у канцы X сталецьця былі прымушаны даць асобных князеу Дрыгвічам і Смаленскім Крывічам.

Такім чынам на зямлі Беларускай утварылася некалькі князьств: Смаленскае на Дняпры, Полацка-Вітэбскае на Дзьвіне і верхнім Немне, ды Тураускa-Пінскае на Прыпяці. Гэтыя князьствы займалі абшар усяе цяперашняй Беларусі. Кожнае з іх было незалежнай дзяржавай з асобным княжым родам - Рагвалодавічамі і Рурыковічамі. Усе яны многа ваявалі, шырока вялі таргоулю, адзначываліся высокай культурай.

К XIV сталецьцю род Рагвалодавічау вымірае. Перш абшырнае Тураускa-Пінскае князьства пабілася на некалькі дробных і слабых князьств, і у іншых з іх уласьць перайшла да жанок.

Як раз у гэтых часах на заходзе, у межах мала-культурнага Літоускага народу, утварылася незалежная Літоуская дзяржава. Першыя літоускія князі прылучылі да гэнае дзяржавы невялікія суседнія беларускія землі і нават сваю сталіцу, Вільню, пабудавалі на зямлі беларускага народу. Гэтак сама і іншыя Беларускія князьства пачалі далучацца да Літвы - часьцю затым, што літоускія князі жаніліся з прадстауніцамі вымірaушых беларускіх княжых родау, часьцю - самахоць, на основе умоу.

Гэтак вялікі князь літоускі папраудзі стауся князям Беларускіх земель. Вялікія князі рабілі умовы з князьствамі Полацкім, Смаленскім і Вітэбскім і давалі ім асобныя конституцыйныя граматы; а там, дзе княжыя роды панавалі далей, мясцовыя князі лічылі сябе прыслухаючымі вялікаму князю літоускаму, вассаламі яго. Гістарычная навука зусім адкідае усе гутаркі аб тым, быццам Беларускія землі былі *заваеваны* літоускімі князямі.

У часах будаваньня Літоускага і Беларускага князьства было ужо усім вядома імя Беларусі і беларусау, якое азначала "Русь" вольную, свабодную ад платы падаткау наездчыкам ("белым" тады наагул называлі чалавека, вольнага ад падаткау), ды гэтак выдзяляла Беларусь ад другіх частак абшырнага "рускага" племі, на которыя татары накладалі падаткі. Злучыушыся з маленькім Літоускім народзікам і прызнаушы найвышэйшую, сувэрэнную уласьць вялікага князя літоускага, кожнае з беларускіх князьств мела поуную незалежнасць і йшчэ доугі час захоувала сувэрэнныя правы.

Гэтак злажылася Літоуска-Беларуская дзяржава, урадова называушаяся *Вялікім Князьствам Літоускім, Рускім*) і Жмудзкім.*

Беларусы пераважывалі у гэнай дзяржаве і сваім чыслом, і сваей якасьцю: пад той час нашы прашчуры адзначываліся ужо высокім разьвіцьцем дзяржаунасьці, мелі свае пісьменства - літэратуру, вялі абшырную таргоулю з немцамі, а літвіны да злучэньня з "Русьсю" ня мелі ні дзяржаунасьці, ні пісьменства, ні торговых зносін і знаходзіліся на вельмі нізкай ступені разьвіцьця. Чысьленая перавага беларусау у гэтай дзяржаве выявіцца з асаблівай яркасьцю, калі прыпомнім, што Літоускі народ займау усяго толькі каля пятай часткі абшару Вялікага Князьства Літоускага. Да таго трэба памятаць, что нават у XVII сталецьці насяленьне сапрауднай Літвы было вельмі рэдкае.

У 1385 гаду вялікі князь літоускі зрабіу саюз з Польшчай і падпісау акт уніі (еднасьці). Аднак, паводле гэтай умовы вялікі князь Літвы і Русі ня губляу свае незалежнасьці. Калі-ж

---

*) Пад той чае цяперашняя расейская зямля называлася зямлей Маскоускай, а Беларус і Украіна йшчэ захоувалі старое імя "Русь". Пасьля, наадварот, гэтае імя пераняла Маскоушчына. Рэд.)

літоускія князі пачалі барацьбу з Ягайлай за поуную незалежнасьць Літвы і Русі, дык іх паддзержывалі якраз беларускія нацыянальныя элемэнты. З гэтай прычыны да 1447 году Літоуска-Беларуская дзяржава то прызнавала найвышэйшую сувэрэнную уласьць польскага караля, то мела сваіх асобных валадароу. Палякі-ж, каб зьвязь Польшчы з Літвой-Русьсю не разарвалася, зумысьля стараліся выбіраць вялікіх князеу Літоускіх на каралеускі пасад. Напрыклад, у 1440 гаду літвіны і беларусы узьвялі на свой вялікі-князяускі пасад Казіміра Ягайлавіча; а калі у 1447 гаду апусьцеу польскі каралеускі пасад, дык палякі выбралі за караля таго-ж Казіміра. У 1492 гаду Літва і Русь, асабліва апошняя, выбралі за вялікага князя Аляксандра Казіміравіча, каторы у 1501 гаду быу выбраны за польскага караля. У 1507 гаду літвіны і беларусы выбралі за свайго вял. князя Жыгімонта Казіміравіча, а сьледам за імі у тым-жа гаду палякі яго-ж узьвялі на польскі трон. Калі-ж літвіны за насьледніка вял. князя йшчэ пры жывым бацьку выбралі Жыгімонта-Аугуста, дык і палякі пайшлі па іх сьлядох. Між іншым, Жыгімонт-Аугуст ад 1544 да 1548 году гаспадарыу у дзяржаве зусім незалежна пры старэнькім бацьку і быу апошнім асобным князям Літвы і Русі.

Гэтак, ад 1447 да 1569 году Літва і Беларусь знаходзіліся у пэрсональнай уніі (еднасьці праз асобу караля) з Польшчай, і гэная форма еднасьці зусім не зачапляла сувэрэнай асобнасці Літоуска-Беларускае дзяржавы.

Але Жыгімонт-Аугуст ня меу дзяцей, ды ужо пачала набліжацца старасьць яго. Польскія дыпляматы бачылі магчымасьць разрыву з Літвой і Русьсю, тым болей, што было вядома аб існаваньні сільнай маскоускай партыі, якая манілася узвясьці на пасад князя з маскоускага царскага роду. Маскоуская партыя выяуляла гэткую думку і раней, - нават пры Ягайлавічах. Вось, палякі напружылі усе свае сілы, каб зрабіць новую умову аб уніі (дзяржаунай еднасьці). Усе злажылася памысна для палякоу. У 1569 гаду Літоуска-Беларуская дзяржава, веушая цяжкую барацьбу за панаваньне над Балтыцкім узьбярэжжам і за места Рыгу, ня маючы сілы перамагчы Маскву, прыстала на унію з Польшчай.

Трэба зауважыць вось што. У часах будаваньня Літвы яна



прылучыла да сябе такжа і паудневa-рускія землі: Валынь, Кіеушчыну і усходнюю частку Падольля. Але гэныя землі былі тады вельмі спустошаны татарамі і у агульнадзяржауным жыцьці прынімалі толькі зусім невялікае учасьце. У 1569 гаду гэтыя землі, а так сама Падляхія (палудзенная частка Гродзеншчыны) были прылучаны палякамі да Польшчы і абернены у польскія правінцыі. Такім чынам пасьля 1569 году толькі беларусы і Літва захавалі сваю незалежнасьць і зрабілі умову аб уніі з Польшчай, як роуны з роуным.

Зьмест акту аб польска-літоускай уніі быу гэткі: абедзьве дзяржавы злучаліся на вечныя часы у такім значэньні, што яны павінны былі мець супольны парлямэнт (сэйм), якому прыналежыць права выдаваць законы і выбіраць супольнага гаспадара - караля і вялікага князя. Аднак, у Літве і Беларусі уласьць вялікага князя выяуляецца незалежна: законы, войска, грошы, фінансы і міністэрствы кожная дзяржава мае асобныя. У акце уніі ня зусім ясна гаворыцца аб тым, у якім складзе супольны сэйм выдае законы для кожнай дзяржавы. У Літве і Беларусі мелі сілу толькі тыя законы, выданыя супольным сэймам, у каторых гэта было спэцыяльна абгаворана. А спэцыяльныя законы для Літоуска-Беларускай дзяржавы разглядаліся толькі літоуска-беларускімі дэпутатамі.

Толькі у другой палавіне XVII сталецьця гэты разьдзел пачау на практыцэ заціраццa і пачалі зьяуляцца супольныя для абедзьвых дзяржау установы. Але гэта ужо былі часы разьдзелу і упадку Літоускага гаспадарства.

А усе-ж унія аказалася пагібельнай як для Польшчы, так і для Літоускай Русі.

Палякі не здаволіліся актам саюзу, а кінуліся апалячываць Русь і акаталічываць яе праваслаунае насяленьнэ, часта апіраючыся на каралеускую уласьць, якая паддавалася іх намовам у рэлігійна-нацыянальных справах. У 1596 гаду палякі, супроць волі вялізарнай большасьці праваслауных жыхарау і карыстаючыся здрадай некалькіх праваслауных біскупау, дабіліся царкоунай уніі, - значыць, злучэньня праваслаунай цэрквы з каталіцкім касьцелам. Тады узьнялася вельмі вострая рэлігійна-нацыянальная барацьба. Націск польшчыны і каталіцтва прымусіу згуртавацца супроць яго усіх праваслауных

беларусау. У каталіцтва перайшла пераважная частка шляхты, прынімаючы ад палякоу разам з рэлігіей іх язык і культуру. Гэтак "вярхі" народу адшчапіліся ад яго "нізоу". Але сільнае мяшчанства па гарадох крэпка бараніла сваю нацыянальнасьць і веру. Сялянства пераходзіла на унію толькі пад прынукай. Усе сілы і засобы багатага і культурнага народу абярнуліся на рэлігійную і нацыянальную барацьбу. Ужо у XVIII сталецьці выяуляецца па местох упадак таргоулі і промыслау. Нельга ня прызнаць, што палякі дайшлі свайго. Польская культура і мова пранікалі усе глыбей і глыбей у вярхі грамадзянства, якія усе болей разрывалі зьвязь з мяшчанствам і сялянствам; апалячываньне шырылася і па гарадох, асабліва вялікшых. Ад другой паловы 17 сталецьця беларуская мова нават пачынае уступаць месца у законах, судох, адміністрацыйных установах лацінскаму або польскаму языку.

Але хоць апалячываньне і акаталічываньне і выяулялася у верхніх слаех народу, - усе-ж сяляне і у значнай меры мяшчанства цьверда баранілі далей свае права на незалежны рэлігійна-нацыянальны быт. То былі цікауныя часы злоснай барацьбы, якая йшла у літэратуры, у школах, у дыспутах і спорках, заходзячы часамі да бітв на кулакі паміж прадстаунікамі розных рэлігій і нацыянальнасьцей. У XVIII сталецьці усе беларускае і праваслаунае цярпела цяжкое гнібеньне. Але тады праваслауныя пачалі шукаць сабе заступніцтва за межамі сваей дзяржавы і уцягіваць у гэну барацьбу расейскую царыцу Кацярыну II.

Кацярына II здауна ласа углядалася на усходнія акраіны Польскай Рэчыпосполітай, дык ахвотна умяшалася у рэлігійныя справы у Беларусі і патрэбу абароны праваслаунай веры выкарыстала дзеля падняцьця пытаньня аб разьдзеле Польшчы. Адна за аднэй суседнімі дзяржавамі былі зроблены тры умовы аб разьдзеле, каторы усе Беларускія землі аддавау Расейскай Імпэрыі у ніжэйпісаным парадку. Паводлуг умоу: 1772 г. з Прусамі і Аустрыей і 1773 - з Польшчай да Расеі адыйшлі: Полацкае ваяводзтва (апрача часткі яго на правым беразі Дзьвіны), Вітэбскае (без Аршанскага павету), Мсьціслаускае і часьці Менскага. Разьдзел 1793 г. дау Расеі Менскае ваяводзтва і значныя часьці Віленскага, Навагрудзкага і Берасьцейскага



га (Брэст-Літоускага). Разьдзел 1795 году аддау Расеі рэшту ваяводзтв Навагрудзкага і Берасьцейскага. Урэшці паводле трактату у Тыльжы (Тільзіт) 1807 году пад расейскае панаваньне перайшла Беласточчына. Так уся Беларусь апынілася у складзе Расейскай Імпэрыі. Палітычная незалежнасьць Беларусі была загублена. Яе свабодныя установы былі прымушаны прыпыніць сваю работу. Ужо за Кацярыны II пачалі завадзіць у Беларусі расейскі дзяржауны лад і расейскія законы. Прауда, Імпэратар Павал вярнуу ізноу Літоускі Статут (зборнік краевых законау), але даунейшага самаупрауленьня цэлком назад не вярнулі. Губэрскія зьезды шляхты часьцю замянялі старыя шляхоцкія сэймікі, але устанауленьне і у Беларусі правоу расейскае шляхты не магло здаволіць беларускую шляхту. Літоускі Статут меу яшчэ сілу да Імпэратарскага указу 1840 году, а з таго часу пачынаецца аканчацельная перастройка суда і упрауленьня на расейскі капыл.

Расейскія парадкі ня толькі зьніштажалі шляхоцкія вольнасьці у палітычным жыцьці, але і мелі на мэці барацьбу з пануючым палажэньнем апалячанай шляхты і каталіцтва, якое вяло палітычную работу. Гэную барацьбу расейскі урад веу няудачна, груба, без ніякае сыстэмы. Расейскі урад бадай да 60-ых гадоу мінулага сталецьця, - значыць, да губэрнатарства М.Н.Муравьева, - кепска разумеу, што ен мае дзела з *Беларускім* краем. Згодна з агульным кірункам сваей палітыкі, урад ня мог абаперціся на больш дэмакратычныя элемэнты: на сялян і мяшчан, на астаткі ніжэйшай праваслаунай шляхты. З гэтай прычыны, - як гэта ні дзiуна, - апалячываньне у пачатку расейскага панаваньня зрабіла вялікі крок упярод, бо расейскі урад пасьпеу ужо адапхнуць ад сябе усіх, хто быу пранікнуты беларускім нацыянальным духам. Прауда, Імпэратар Мікалай I у 1839 гаду аб'явіу прымусовае прылучэньне уніятау назад да праваславія, але гэты акт быу толькі новым гвалтам над людзкім сумленьнем і яшчэ больш настроіу народ процi расейскага правіцельства. Дык і ня дзіва, што і у 1831 і у 1863 г.г. Беларускія землі крэпка паддзержывалі польскія паустаньні. Да паустаньняу прылучаліся ня толькі апалячаныя шляхоцкія элемэнты, але і людзі розных станау, у тым ліку сяляне і рамесьнікі: бо тут справа йшла ня толькі аб адбудову Польшчы у яе старых

межах, але і аб вызваленьне з пад цяжкага маскоускага панаваньня.

## III.

Усе вышэйпісаныя факты - гэта фармальная старана разьвіцьця нашае дзяржаунасьці. З іх ясна відаць, што у першых часах сваей гісторыі Беларусь была асобным, незалежным князьствам, якое мела усе адзнакі дзяржаунай сувэрэннасьці. У другі пэрыод - у часах злучэньня Беларусі з Літвой - гэтае злучэньне сперша мела форму фэдэрацыі Полацкага, Вітэбскага і Смаленскага князьства з князьствамі Віленскім і Троцкім - пад той час, як на іншых беларускіх землях яшчэ оставаліся удзельныя князі (Тураускa-Пінскія, Слуцкія, Мсьціслаускія, Старадубскія і інш.), бышыя у вассальнай залежнасьці ад вялікага князя Віленскага. На тым, што злучэньне памянутых князеустз станавіла *фэдэрацыю*, годзяцца усе вучоныя. Але тагочасныя людзі разумелі гэную фэдэрацыю, як пэрсональную унію (еднасьць праз асобу гаспадара), пры каторай вялікі князь Літоускі быу адначасна і князям Полацкім, Смаленскім і Вітэбскім, меу у кожным князьстве свой двор, спауняу свае чыннасьці, прыжджаючы у кожнае князьства асобна. Толькі каля сярэдзіны XVI сталецьця гэная форма пэрсональнай уніі зьмяняецца у фэдэрацыю паадзінокіх зямель, каторыя пасылаюць сваіх прадстаунікоу у агульна-земскі парлямэнт. Акт 1569 году нельга лічыць за адну з вядомых цяпер дзяржаунаму праву форм зліцьця асобных зямель у адну дзяржаву - злучэньня *унітарнага*. У навуцы унія 1569 году называецца *парлямэнцкай уніей*, пры чым сувэрэнныя правы злучанага Літоуска-Беларускага гаспадарства былі акуратна абгаворaны у гэтым акце і мелі сілу ажно да прылучэньня Беларусі да Расеі.

Але у канцы XVIII сталецьця Беларусь аказалася прылучанай да Расейскай Імпэрыі, утраціушы свае сувэрэнныя правы - правы незалежнай дзяржавы. Некаторыя асаблівасьці у законах, вытварыушыяся згодна з яе гістарычным разьвіцьцем, Беларусь захавала да 1840 году.



З гэтага вынікае, што Беларусь, як і яе суседка Літва, мае такія-ж правы на адбудову сваей дзяржаунасьці, як і Польшча. Тое, што Беларусь і Літва нейкі час знаходзіліся у уніі з Польшчай, не пазбауляе іх права на адбудову дзяржаунай незалежнасьці у форме супольнага Беларуска-Літоускага гаспадарства, ці нават у форме асобных дзяржауных арганізацый, бо і на гэта і Беларусь і Літва маюць як агульнае права кожнай нацыянальнасьці жыць незалежным жыцьцем, так і правы гістарычна-юрыдычныя.

Цяпер прыходзіць пара папpавіць гістарычныя абмылкі мінуушчыны - тым больш, што Беларуская нацыя апіраецца на крэпкіх фундаментах дзяржаунасьці на шырокіх дэмакратычных асновах і мае трывалыя асобеннасьці адметнай гістарычнай культуры.

Гэтыя асобеннасьці чырвонай ніткай праходзяць цераз усю мінуушчыну беларусау і цераз іх сучасны быт, і вось да іх мы з чароду пэройдзем.

## IV.

Найдаунейшыя часы гісторыі Беларусі адзначаны панаваньнем дэмакратычных ідэй у грамадскім і гаспадарскім ладзе. Найвышэйшая уласьць прыналежыць *вечу*, або народнаму сходу, каторы у Вітэбску і Полацку выбірау князеу, а у Смаленску і Тураве бяз згоды яго уласьць не магла перахадзіць ад аднаго князя да другога. Разьдзелу на станы ня было: панавала роунасьць. Гэткі лад дзяржауся да пачатку XVI сталецьця, калі перакінуушыйся з Літвы і Польшчы разьдзел на станы зрабіу вялікія перамены у старабытных дэмакратычных парадках. Аднак, кожын з трох станау, на якія быу падзелены беларускі народ, захавау сьляды даунейшае уласьці народу. Пакуль сяляне былі вольныя, яны мелі свае валаснoе веча і валасны суд, датрываушыя блізка да сярэдзіны XVII сталецьця шмат у якіх мясцох і перайшоушыя пасьля у сельскія арганізацыі і сходы, жывыя і цяпер. Месты аставаліся вольнымі грамадамі; у іх дэмакратычная роунасць і суды былі забаспечаны каралеускімі прывілеямі, за якія мяшчане у патрэбі умелі бароцца. Вышэйшы ваенна-

служэбны стан выпрацавау для сябе такую форму констытуцыі, каторая давала гэтаму стану права вельмі шырокага учасьця у справах гаспадарства, пачынаючы ад выбару вялікага князя і канчаючы справамі вайны і міра і правадауства. Констытуцыю баранілі асобныя прывілеі, выпауняць каторыя вялікія князі запрысягаліся. Шляхоцкі стан, як ваенна-служэбны, дабіуся найбольш у разьвіцьці парлямэнцкага устройства. Сперша ен складауся з двох слаеу: панства-арыстакратау і неарыстакратау. Нерадавітыя элементы дабіліся поунай роунасьці з радавітымі, абдоранымі прывілеямі. Але шляхоцкага стану у Беларусі нельга зусім раунаваць да шляхты у Заходняй Эуропе. Шляхта у Літве і Беларусі - і асабліва у Беларусі - была вельмі чысьленая і сваей заможнасьцю перэважна ня рожнілася ад сялян. Гэта - тыя-ж адвечныя земляробы, дробныя землеуласьнікі, якіх бралі на ваенную службу: яны сваімі уласнымі рукамі выраблялі зямлю, маючы яе часта зусім мала. На іх долю выпадала найцяжэйшая служба у гасударстве, і вось за гэту службу іх абдорывалі прывілеямі, і яны у сваіх правох зьліліся з нячысьленым радавітым, часьцю тытулованым панствам, паходзіушым ад старых княжых родау.

Панаваушый у Літоуска-Беларускім гаспадарстве дзяржауны лад - гэта лад *рэспублíканскі* з выбарным дажывотна прэзыдэнтам, каторы называуся вялікім князям. Так у новай форме адрадзілася традыцыя народнае уласьці старой Русі. Гістарычныя рэспубліканскія традыцыі нашага народу не на жарт палохалі царскае правіцельства: у межах быушай Расейскай Імперыі ня было другой старонкі, да каторай царскі урад адносіуся-бы гэтак-жа сурова, як да Беларусі. Зьнішчыушы польска-беларускія школы, расейскі урад ня дау нам ніводнай вышэйшай школы, нават духоунай акадэміі, ды блізка зуім не адкрывау гімназій, а да істнуючых адносіуся так, што за Аляксандра III числo школ і вучняу у іх нават паменшала, раунуючы да ранейшых часау. Урадовая палітыка вельмі шмат памагала апалячываньню краю, бо усе, хто думау аб палітычным вызваленьні, далучаліся да палякоу, з каторымі спадзяваліся разам дайсьці спауненьня сваіх ідэалау. Не прызнаваючы беларусау - местовых і вясковых, урад пазбауляу нас сваей інтэлігэнцыі. За чыноунікау назначалі у нас



вялікарусау, нязнаемых з нашым жыцьцем і часта мала здатных да працы. Быу нават выданы прыказ, каб беларусау не назначалі за біскупау. Нястача вышэйшых школ, немагчымасьць для беларусау неяк устроіцца у адным з адміністрацыйных пунктау краю зрабілі тое, што беларуская інтэлігэнцыя пакідала сваю Бацькаушчыну і вандравала на чужыну. У местох Беларусі яна не магла умацавацца йшчэ і затым, што, выходзячы з народу, ня здолела увайсьці у таргова-прамысловае жыцьце, - дый тое, прауду кажучы, было у нас слаба разьвіта. Ведама, нястача тутэйшай інтэлігэнцыі у свой чарод была аднэй з прычын застою у таргоулі і прамышленасьці.

Змагаючыся з беларускай культурай і яе прадстаунікамі, расейскія уласьці - інстынктыуна, ці мо'і сьвядома - разумелі самабытнае значэньне гэтай культуры і баяліся яе.

Запрауды, з культурнага пагляду беларускі народ можа з гордасьцю успамінаць аб сваей мінуушчыне. Пачынаючы ад XII сталецьця, беларуская нацыянальнасьць уславілася і у навуках і у літэратуры. Імены такіх пісьменнікау і культурных дзеячоу, як Кірыла Тураускі, Абраам Смаленскі, Клімант Смаляціч, Еуфрасінія Полацкая уславілі цэлую эпоху стараруcкай прасьветы і пісьменства. У часах літоуска-беларускай дзяржавы мы бачым высокае разьвіцьце у беларусау літэратуры і права. Беларуская мова была вельмі пашырана. Ад канца XIV сталецьця нават у Літве і Жмудзі большая частка жыхарау ужывала дома старабеларускай мовы, а у судох і адміністрацыйных установах беларускі язык быу абавязковы, як урадовы. Ня толькі практыка, але і закон прызнавау дзяржаунасьць і абавязковасьць беларускага языка. Толькі дэкрэтам 1697 г. яго замяніла польская мова.

У Беларускай мове зьявіліся найстарэйшыя і з навуковага пагляду найлепш уложаныя зборнікі беларускіх законау, раунуючы да другіх памятнікау рускага права: Літоускія Статуты у трох выданьнях - 1529, 1566 і 1588 г.г.*. Гэта - плод працы выдатных юрыстау, вельмі удачна злучыушых асновы старога нацыянальнага права з законамі навейшага правадауства.

*У арыгінале надрукавана 1586 і 1598 г.г.

Такім чынам статутовае права - гэта у значнай меры нашае нацыянальнае права. І гэта тым больш цікауна, што пазьнейшыя выданьні статутау пераглядаліся камісіей, зложанай з беларускіх юрыстау, праходзіушых навукі у заходня-эуропэйскіх унівэрсытэтах. Наагул, разьвіцьце навукі права у Беларусі было надта высокае, што відаць ня толькі з старых дакумэнтау і правадаучых актау, але і з знамянітых прымернікау адвакацкіх прамоу на судзе. Дык дзіва няма, што у пачатку другой палавіны XVI сталецьця мы ужо бачым у Вільні першы юрыдычны факультэт, на каторым беларуска-літоускае і нямецкае права выкладалі беларускія вучоныя юрысты.

У другіх галінах літэратуры беларуская культура выявіла сябе гэтак сама ярка. Па беларуску выйшау у сьвет першы у Расеі друкаваны пераклад кніг сьвятога пісьма - слауная праца першага беларускага народніка, доктара мэдыцыны "з слаунага места Полацка"; Францішка Скарыны, працаваушага над сваім выданьнем у Празе і у Вільні у самым пачатку XVI сталецьця. Беларуская-ж літэратура мае першага панславіста у асобе Васіля Цяпінскага, земляка Скарыны, ператлумачыушага на беларускую мову евангельле у сярэдзіне XVI ст. Нават толькі тая друкаваная і пісаная беларуская літэратура, якая да нас дайшла у кнігах багаслужэбных, рэлігійна-палемічных творах, аповесьцях, летапісях, граматыках і інш., дае доказ шырокага культурнага разьвіцьця Беларусі, асабліва-ж нязвычайнага разьвіцьця беларускага языка. Друкаваньне кніг пачалося у Беларусі у самым пачатку XVI сталецьця, а у канцы таго-ж сталецьця можна было ужо налічыць дзясяткі друкарняу, параскіданых па розных местох і мястэчках.

Прауда, пасьля бліскучага разьвіцьця у XVI ст. беларуская культура і літэратура у чародны пэрыод пачала упадаць. Сама по сабе беларуская культура была моцная, бо яна была крэпка зьвязана з нацыянальнай верай і з цьвердай сьвядомасьцю нацыянальнай дзяржаунасьці. Аднак, гэтакая рэлігійна-нацыянальная пазыцыя станавіла і вялікую небаспеку у часах рэлігійнай барацьбы, абхапіушай усю Заходнюю Эуропу.

Першы удар беларускай нацыянальнай справе зрабіла пратэстантцва, прыйшоушае у Беларусь у форме кальвінізму і соцыніянства. З пагляду на культурную работу, пратэстанцтва



не пярэчыла устаноуленай традыцыі і, працуючы дзеля рэлігіі, прыкладала руку да адкрываньня школ, падняцьця прасьветы і нават пашырэньня літэратуры, бо многа пратэстантау-беларусау карысталася роднай беларускай мовай для шырэньня новай веры. Дый у праваслаунай цэркві у Беларусі было шмат такога, што зближала яе да пратэстанцтва: учасьце сьвецкіх людзей у царкоуным жыцьці, саборнасьць царкоунага устройства. Але пратэстанцтва прынослла з сабой ідэі інтэрнацыяналізму і разьбівала крэпкую спайку насяленьня з старой верай.

Калі пратэстанцтва пачало губляць сваю вагу і пачалася рэлігійная рэакцыя (паварот назад), адзначыушаяся у Беларусі такой шырокай працай езуітау, якой ня ведалі іншыя старонкі, - тады пратэстанты з быушых праваслауных пачалі шыбка перахадзіць на каталіцтва. А як да езуітау належалі пераважна палякі, дык справа пашырэньня каталіцтва скора абярнулася у апалячываньне беларусау. Асабліва пачала польшчыцца шляхта. Дзеля тэй-жа мэты - акаталічываньня і апалячываньня беларусау - быу перакінут мост між праваслаунай цэрквай і каталіцтвам у форме Берасьцейскай царкоунай уніі у 1596 гаду, праведзенай супроць волі народу жменяй біскупау, адрокшыхся праваслаyя і даддзержаных усей сілай уласьці караля Жыгімонта III. Насталі цяжкія часы рэлігійнай і нацыянальнай барацьбы.

А усе-ж беларускі народ перартрывау гэту барацьбу, у значнай меры месты і усе сялянства асталіся вернымі сваей нацыянальнасьці, нават і прыняушы унію, ня гледзячы на прымусовы способ правядзеньня яе. Праваслауныя брацтвы далі стойкі прыклад абароны сваей нацыянальнасьці. Яны адбаранілі Беларускую культуру, пісьменства, прасьвету і цераз эпоху уціску уважліва данясьлі нацыянальныя традыцыі і пачуцьце нацыянальнай самабытнасьці да пачатку XIX ст., калі рэлігійная барацьба утраціла свае значэньне.

У XIX сталецьці і да нашых дзен беларуская нацыянальная ідэя не замірала ні на адзін мамэнт, Прауда , сперша польская, а пасьля расейская культура прыцягівала да сябе многа лепшых сыноу Беларусі. Польская культура узбагацілася гэткімі сынамі нашае Бацькаушчыны, як Тадэуш Касьцюшка, Сыра-

комля , Крашэускі і нават Адам Міцкевіч. Усе-ж прыемна адзначыць, што тры апошнія прадстаунікі польскай літэратуры з вялікай любасьцю да роднага краю і яго народу пісалі на родныя матывы, толькі карыстаючыся польскай мовай, падобна як слауны сын Украіны Гоголь карыстауся расейскай. Яны, як і многа іншых, ніколі не адрываліся ад роднага краю і не разрывалі зьвязі з тым беларускім гуртком, каторы часьцю у польскай, часьцю у роднай беларускай мове працавау над адраджэньнем і паддзержкай беларускай нацыянальнай ідэі. Даволі назваць такія імены, як гісторыкау Нарбута і Кіркора, праф. Ярошэвіча, Даніловіча, Кукольніка, імены этнаграфау, паэтау і бэлетрыстау, як Ян Чэчот, Ян Баршчэускі, Дунін-Марцінкевіч і многа іншых, каторыя стварылі слауную эпоху нацыянальнага адраджэньня беларусау ад 30-ых да 60-ых гадоу мінулага сталецьця.

Як быццам замершая на чверць веку пасьля Мурав'еускай гаспадаркі ідэя беларускага адраджэньня пачала ізноу выяуляцца ужо у канцы 80-ых гадоу - сперша, з прычыны цэнзурнага уціску, вельмі нясьмела то у форме стацей і кніжак, даводзіушых самабытнасьці беларускай этнаграфіі і гісторыі, пісаных Сапуновым, Стукалічам, Нікіфароускім, Доунар-Запольскім, Карскім і другімі, то хаваючыся у нелегальных віленскіх і мінскіх арганізацыях. Але яна дайшла шыбкага і буйнага расцьвету у самым пачатку рэвалюцыйнага руху. Зьявіліся гурткі, арганізацыі, журналы, газэты. Паяуленьне "Нашай Нівы", імены Янкі Купалы і іншых паэтау, грамадзкая і літэратурная праца братоу Луцкевічау і доугага сьцягу іншых працаунікоу і арганізацый становяць цэлую эпоху у гісторыі разьвіцьця беларускай нацыянальнай сьвядомасьці. Увесь беларускі рух апошняга часу ажно да Усебеларускага Зьезду у Менску у сьнежні 1917 году і да утварэньня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі сьведчыць аб здольнасьці да жыцьця беларускай нацыянальнасьці і аб крэпкай зьвязі яе з дзяржаунай незалежнасьцю.

Да гэтага агляду трэба было-бы дадаць факты, якія выдзяляюць этнаграфічны тып беларуса - самабытны і адменны ад другіх рускіх народнасьцей, тып чыстага славяніна, - а также факты, паказываючыя эканамічную абасобленасьць Беларусі.



Каб лішне не пашыраць нашай кароткай запіскі у гэты бок, мы у канцы лічым патрэбным яшчэ раз цьверда адзначыць тыя вывады, якія логічна вынікаюць з вышэйсказанага. Народ, каторы праз колькі сот гадоу самага цяжкага гістарычнага жыцьця, ня глядзячы на вострую нацыянальную барацьбу і на уціск урадам найдужэйшай на сьвеці дзяржавы, ня утраціу сваей нацыянальнай самабытнасьці, - народ, меушый праз некалькі сталецьцяу сваю дзяржауную незалежнасьць, - народ, каторы мае вытвораную вякамі культуру і літэратуру, свае яркія асобеннасьці этнаграфіі і языка, - такі народ мае і цяпер усе правы на дзяржауную незалежнасьць. І гэтае права з тым большай справядлівасьцю павінна быць паддзержана у той мамэнт, калі уваскрасаюць і прызываюцца да новага жыцьця другія нацыянальнасьці, незалежны быт каторых ня быу ані гэткі доугі, ані гэтак абасоблены. Ведама, тут узьнімаецца важнае пытаньне аб варунках і формах дзяржаунай незалежнасьці: ці выбраць поуную, абасобленую ад другіх незалежнасьць, ці фэдэрацыю з блізкімі па крыві суседзямі. Гістарычная навука не павінна браць на сябе разьвязку гэтага пытаньня і абмежываць выбар. Яна дае толькі адзін вывад, каторы дыктуецца гістарычна злажыушымися акалічнасьцямі: народ, у якім гістарычна вытварылася здольнасьць да жыцьця і жыцьцевая сіла, будзе зауседы бароцца і бараніць свае правы, а, значыць, можа нарушаць агульны спакой датуль, пакуль ня будуць здаволены яго нацыянальныя патрэбы, правы і дамаганьні забаспечаньня яго нацыянальнага быту.

Праф. М. ДОУНАР-ЗАПОЛЬСКІ

*Kiev, 1918*

Выданне "Асноў дзяржаўнасьці Беларусі"
М.Доўнар-Запольскага падрыхтавана

## АГЕНЦТВАМ "ГЕРОНТ-А" ТБМ
## ім.Ф.Скарыны

Дзейнасць Агенцтва "ГЕРОНТ-А" накіравана на:

*папулярызацыю гістарычных ведаў пра мінулае Беларусі;*
*прапаганду ідэй сацыяльнай і нацыянальнай згоды.*

Агенцтва "ГЕРОНТ-А" ажыццяўляе навукова-даследчую дзейнасць па наступных напрамках:

*гісторыя; генеалогія;*
*краязнаўства; этнаграфія.*

Агенцтва "ГЕРОНТ-А" рыхтуе інфармацыйны бюлетэнь, у якім Вы знойдзеце звесткі аб усіх публікацыях па гісторыі Беларусі, якія з'яўляюцца ў айчынных часопісах і газетах (выходныя дадзеныя + кароткая анатацыя); перыядычнасць выхаду бюлетэню - 1 раз у паўгода.

Агенцтва "ГЕРОНТ-А" запрашае ўсіх, хто цікавіцца генеалогіяй:

*азнаёміцца з навінамі генеалагічнай літаратуры;*
*атрымаць практычную дапамогу ў складанні радаводаў;*
*аб'яднацца з аднадумцамі ў справе развіцця тэорыі і практыкі генеалагічных даследванняў.*

*ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА КАРЭСПАНДЭНТАЎ*

Тэлефоны ў Мінску: (8-0172) 249-113, 365-017



Навукова-папулярнае выданне

Доўнар-Запольскі Мітрафан Віктаравіч

**АСНОВЫ ДЗЯРЖАЎНАСЬЦІ БЕЛАРУСІ**

Адказны за выпуск Гануш Аляксандр Генадзевіч

Тэхн. рэдактар М.В.Жукавец  Карэктар Н.Д.Захарава

Здадзена ў набор 15.02.94.  Падпісана да друку 10.03.94.
Фармат 60x84 1/16. Папера афсетная. Гарнітура Gentury. Друк афсетны.
Ум.друк.арк. 1,39. Ул.-выд.арк. 1,1. Тыраж 10000 экз. Заказ 91.
Агенцтва "ГЕРОНТ-А". 220088, Мінск, вул.Пуліхава, 29/123.

Выдавецка-паліграфічнае прадпрыемства Дзяржэканомплана Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 194. 220600, Мінск, пр.Машэрава, 23.